# ЖАНР РАМАНА Ў ГІСТАРЫЧНАЙ ПЕРСПЕКТЫВЕ

***Хаменка Н. В.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік*** *– А. У. Сузько, канд. філал. навук, дацэнт*

Гістарычны раман – жанр спецыфічны. Яго ўзнікненне і развіццё ў межах нацыянальнай літаратуры кожнага народа абумоўліваецца як самім працэсам развіцця літаратуры, так і ўсведамленнем этнасам сваёй гісторыі як часткі гісторыі чалавецтва, свайго месца і ролі ў працэсе гістарычнага развіцця сусветнай цывілізацыі.

Беларускі гістарычны раман у сваім развіцці прайшоў даволі складаны шлях. Перш за ўсё гэта абумоўлена гістарычным лёсам беларускага народа і нацыянальнай літаратуры. Фарміраванне нацыянальнай культуры праходзіла ў надзвычай складаных умовах, якія наўрад ці можна назваць спрыяльнымі, пагэтаму беларускі літаратурны гістарычны раман заўсёды быў чымсьці большым за мастацкі твор. Ва ўмовах размытай нацыянальнай ідэнтыфікацыі гістарычныя творы выконваюць пэўную ідэалагічную функцыю, спрыяюць фарміраванню этнацэнтрычнага светапогляду, падаючы гісторыю праз прызму нацыянальнага і агульначалавечага.

Першая значная спроба адлюстраваць сродкамі мастацкай літаратуры падзеі беларускай гісторыі звязана з імем пісьменніка і грамадскага дзеяча Язэпа Дылы (1880–1973) (ён жа Назар Бываеўскі, Тодар Кулеша). Ён з’яўляецца аўтарам незакончанага гістарычнага раман “На шляху з варагаў у грэкі”. Сваёй лаканічнасцю ў апісанні рэчаіснасці твор блізкі да падарожных нататак.

Адраджэнне беларускай гістарычнай прозы па праву звязваюць з імем славутага беларускага пісьменніка і паэта Уладзіміра Караткевіча. Такія творы, як “Дзікае паляванне караля Стаха”, “Сівая легенда”, “Ладдзя роспачы”, раманы “Каласы пад сярпом тваім”, “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”, сталі адметнай з’явай у беларускай літаратуры. Мастацкаму стылю пісьменніка ўласціва рамантычнае бачанне рэчаіснасці, пэўная ідэалізацыя герояў. Найвялікшая заслуга Уладзіміра Караткевіча – у тым, што ён з вялікай сілай мастацкай пераканаўчасці фактычна “адкрыў” для чытача забытыя старонкі беларускай гісторыі.

Актыўнае развіццё беларускі гістарычны раман атрымаў у другой палове 80-х гадоў XX стагоддзя. Гэты працэс у першую чаргу звязаны з імёнамі такіх аўтараў, як Уладзімір Арлоў, Людміла Рублеўская, Леанід Дайнека, Вітаўт Чаропка, Вольга Іпатава, Генрых Далідовіч і інш. Грамадскія падзеі канца 80-х – пачатку 90-х гадоў, а менавіта набыццё краінай суверэнітэту, фарміраванне нацыянальнай дзяржавы, у значнай меры абумовілі ўздым жанру гістарычнай прозы.

Уладзімір Арлоў лічыць, што кожны народ стварае свой гістарычны міф. Задача літаратурнай “міфатворчасці” заключаецца ў тым, каб у вобразнай, мастацкай форме данесці да чытача значнасць нацыянальнай гісторыі, аднавіць духоўную сувязь паміж пакаленнямі. Менавіта ад ступені ўсведамлення народам свайго гістарычнага шляху залежыць існаванне грамадства, яго гатоўнасць рэагаваць на выклікі звонку, здольнасць да самазахавання і самааднаўлення.

МГПУ им. И.П.Шамякина